**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# ЗБОР ДАКУМЕНТАЎ ДЗЕЯЧАЎ МАСТАЦТВА

**[да 2014]-2025**

**ФОНД № 374**

**ВОПІС № 3**

**1945–2013 гг.**

**МІНСК 2026**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 3 ф. 374**

| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ С.У. АСТРОЎСКАЙ | 1-2 | 1 |
| 2. | ЭЦЮД ДА КАРЦІНЫ Г.С. ВІЕРА | 3 | 1 |
| 3. | ЭЦЮД ДА КАРЦІНЫ В.Ф. КАЗАЧЭНКІ | 4 | 1 |
| 4. | ЭЦЮД ПЕЙЗАЖА І.Р. КРАСНЕЎСКАГА | 5 | 1 |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ Я. КУЗЬМІЦКАГА | 6-7 | 1 |
| 6. | ЭЦЮД ДА КАРЦІНЫ К.І. ЛЕБЕДЗЕВА | 8 | 1 |
| 7. | ЭЦЮДЫ ПЕЙЗАЖАЎ Г.А. МІЛКОВА | 9-10 | 2 |
| 8. | ПАРТРЭТЫ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ І ІНШ. А.А. НАЛІВАЕВА | 11-37 | 2-3 |
| 9. | ЭЦЮД ПЕЙЗАЖА М. НОЙС-ШТУБЭ | 38 | 3 |
| 10. | ЛІНАГРАВЮРА З ВЫЯВАЙ СПАСА-ЕФРАСІНЕЎСКАГА МАНАСТЫРА Ў ПОЛАЦКУ | 39 | 4 |
| 11. | ТВОРЧЫЯ ПРАЦЫ НЕЎСТАНОЎЛЕНЫХ МАСТАКОЎ | 40-45 | 4 |

## Прадмова

У выніку навукова-тэхнічнага апісання быў складзены вопіс № 3 у колькасці 45 спраў (51 дакумент) за 1945–2013 гады. Вопіс складаецца з 11 раздзелаў, сістэматызаваных па алфавіце прозвішчаў фондаўтваральнікаў.

Першы раздзел складаецца з нацюрморта С.У. Астроўскай “Мае кніжкі любімага паэта”, яе аўтабіяграфіі (аўтограф) і біяграфічных звестак, запісаных Я.Я. Квяткоўскай; фатаграфіі С.У. Астроўскай, індывідуальная і ў групе з С.Л. Абрамовіч, В.В. Дзёмкінай, С.С. Катковай, Я.Я. Квяткоўскай, З.В. Літвінавай, М.С. Ракіцкене і інш.

**Астроўская Святлана Уладзіславаўна** нарадзілася 13 студзеня 1940 г. У 1947–1957 гг. вучылася ў сярэдняй школе г. Мінска. Скончыла аддзяленне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Мінскага мастацкага вучылішча (1957–1960 гг.). У 1960 г. працавала мастаком на Мінскай кінастудыі “Беларусьфільм”. У 1961 г. паступіла на вячэрняе аддзяленне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (ткацтва) Мінскага мастацкага інстытута. У 1962 г. перавялася ў Талінскі мастацкі інстытут (Эстонія) на дзённае аддзяленне на гэтую ж спецыяльнасць, які скончыла у 1966 г. З 1967 г. працавала мастаком у Мінскім мастацка-вытворчым камбінаце. Сябра Саюза мастакоў. Удзельніца мастацкіх выстаў.

С.У. Астроўская памерла 21 сакавіка 2013 г.

Другі раздзел прадстаўлены эцюдам да карціна Г.С. Віера “Встреча Красной Армии”. **Віер Гаўрыла Сямёнавіч** нарадзіўся 6 красавіка 1890 г. у мястэчку Пуцінтэй (Бесарабская губерня, Расійская імперыя (цяпер Малдова). З 1905 года вучыўся і працаваў у Мінску ў іканапіснай майстэрні П. Курбатава, у 1910–1912 гадах вучыўся ў Пецярбургу ў мастака С. Ягорава, скончыў там у 1916 г. Рысавальную школу таварыства заахвочвання мастацтваў. У 1921 г. вярнуўся ў Мінск, працаваў дэкаратарам у тэатры «Чырвоная зала», выкладаў у чыгуначным тэхнікуме.

Аўтар твораў “Змітрок Бядуля”, “Кандрат Крапіва”, “Курлоўскі расстрэл”, “Лядовае пабоішча”, “Малады мастак”, “Маладыя спартсмены”, “Старое і новае”, “Суботнік”, “Сямейны партрэт”, “3 ліпеня 1944 года ў Мінску” і інш.

Г.С. Віер памёр 7 сакавіка 1964 г. у Мінску і пахаваны на Кальварыйскіх могілках.

У трэці раздзел увайшоў эскіз да карціны В.Ф. Казачэнкі “Получил пионерский галстук”. **Казачэнка Віктар Фёдаравіч** нарадзіўся 1 мая 1920 г. у г. Гомелі ў сям’і рабочага вагона-рамонтнага завода. У 1928–1938 гг. вучыўся ў Гомельскай сярэдняй школе № 4. У 1939 г. паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута імя Чкалава, але

у 1941 г. вымушаны быў спыніць навучанне па прычыне цяжкай хваробы. З дзяцінства захапляўся маляваннем. Наведваў Гомельскую студыю выяўленчага мастацтва пры Доме культуры чыгуначнікаў імя У.І. Леніна, дзе выкладалі Б.Ф. Звінагродскі і А.М. Шаўчэнка. У 1945 г. прыняты кандыдатам у Саюз мастакоў БССР. Сябра Саюза мастакоў БССР з 1957 г. Удзельнік мастацкіх выстаў з 1945 г. Працаваў ў станковым жывапісе ў жанрах тэматычнай карціны, індустрыяльнага і лірычнага пейзажа. Асноўныя творы: "Василевичская ГРЭС", "Вечер на Соже", "Газопровод", "Гомсельмаш", "Гомельский порт", "Индустриальный пейзаж", "Молотьба", "На Гомельском суперфосфатном", "На Соже", "Новостройки Гомеля", "Осень", "Половодье", "После дождя", "Причал", "Речицкий край" і інш. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Гомельскім абласным краязнаўчым музеі, фондах Беларускага саюза мастакоў і інш.

В.Ф. Казачэнка памёр 27 лютага 1998 г.

Чацвёрты раздзел – эцюд пейзажа І.Р. Краснеўскага "На пристани". **Краснеўскі Іван Рыгоравіч** нарадзіўся ў 1909 г. на Бабруйшчыне. Беларускі мастак, настаўнік па адукацыі. Дырэктар сярэдніх школ Бабруйска і Баранавіч (1934–1941). У гады Вялікай Айчыннай вайны – удзельнік партызанскага руху. З 1947 г. па 1963 г. быў першым дырэктарам Мінскага мастацкага вучылішча (цяпер – Мінскі дзяржаўны мастацкі каледж імя А.К. Глебава).

І.Р. Краснеўскі памёр у 1996 г.

Пяты раздзел гэта дакументы Я. Кузьміцкага (карціна "Далёкая блізка", буклет з яго біяграфіяй, фатаграфія). **Кузьміцкі Ян** нарадзіўся ў 1934 г. у в. Багданаўцы (цяпер Шчучынскі раён Гродзенскай вобласці). У 1957 г. выехаў у Польшчу, потым былі Аўстрыя, Ізраіль, Турцыя, Грэцыя, Італія, Францыя. Канчаткова пасяліўся ў Швецыі, у г. Упсала (Uppsala). Займаўся жывапісам і скульптурай.

Шосты раздзел – эцюд да карціны К.І. Лебедзева "Партизаны на переправе". **Лебедзеў Канстанцін Іванавіч** – аўтар сюжэтных карцін на тэму партызанскага і падпольнага руху на тэрыторыі Гомельшчыны, а таксама партрэтаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Сёмы раздзел складаецца з эцюдаў пейзажаў Г.А. Мілкова "Вечер", "Память". **Мілкоў Генадзь Адрыянавіч** нарадзіўся 8 лютага 1926 года ў сяле Кінтанава Любімскага раёна Яраслаўскай вобласці ў сям'і протаіерэя Адрыяна Мікалаевіча Мілкова. Пасля сёмага класа хацеў паступаць у Яраслаўскае вучылішча, але пачалася Вялікая Айчынная вайна. У 1942 г. аднавіліся заняткі ў мастацкім вучылішчы, куды ён і паступіў. Восенню 1943 г. Мілкоў быў прызваны ў Чырвоную Армію. У 1950 г. дэмабілізаваўся і зноў паступіў у Яраслаўскае мастацкае вучылішча, якое скончыў у 1955 г. і быў накіраваны на

працу настаўнікам малявання і чарчэння ў Чалябінскую вобласць. У 1959 г. пераехаў у г. Гомель. Удельнічаў у шматлікіх абласных і некаторых рэспубліканскіх выставах Беларусі. Пасля выбуху на Чарнобыльскай АЭС пераехаў на радзіму ў Яраслаўскую вобласць у г. Любім. Апошнія гады свайго жыцця жыў у свайго сына Ігара ў Калінінградзе. Стварыў шмат пейзажаў, партрэтаў, карцін на гістарычныя і бытавыя тэмы: “Белый снег России”, “Берёзы над землёй”, “В дозоре”, “Врасплох”, “Выжить и противостоять”, “Гомель. XII”, “Город-крепость Любим. XVI век.”, “Дорога от храма”, “Замок в Буженинове”, “За тем поворотом – необыкновенно красивый простор”, “Изборск”, “Илья Муромец”, “Кинтаново. Тихий плёс”, “ЛЭП сквозь Сибирь”, “Метель”, “Невский Борис Васильевич”, “Ненастье”, “Неперспективная деревня”, “Несжатые хлеба”, “Никто здесь больше не живёт”, “Одичавший кот”, “Опрокинутая лампада”, “Остывшее блюдо Бобруйского котла”, “Пасмурное утро хмурого столетия”, “Пастух”, “Рассвет над Ярославлем. XI век”, “Русь многострадальная”, “Свет небес высоких”, “Седой Урал”, “Святое”, “Сломанное дерево”, “Сумерки. Тишина”, “Тропинка в небо”, “У родного очага”, “Черная речка” і інш. Карціны Г.А. Мількова захоўваюцца ў Гомельскім палацава-паркавым ансамблі, Веткаўскім музеі народнай творчасці і Чачэрскім гісторыка-этнаграфічным музеі, у асабістых зборах беларускіх і рускіх калекцыянераў. У г. Любіме на аснове перададзеных мастаком прац была створана карцінная галерэя.

Г. А. Мілкоў памёр у 2011 г.

У восьмы раздзел увайшлі партрэты беларускіх дзеячаў літаратуры і мастацтва і інш. А.А. Наліваева, якія былі перададзены ў БДАМЛМ супрацоўнікам бібліятэкі БДПУ імя Максіма Танка Г.В. Кажамякіным у снежні 2025 г. Справы ў раздзеле сфарміраваны па алфавіце прозвішчаў дзеячаў. **Наліваеў Анатоль Аляксандравіч (Абраам Налівай)** нарадзіўся 1 кастрычніка 1931 г. у г. Рагачове Гомельскай вобласці. Перад Вялікай Айчыннай вайной сям’я пераехала ў Мінск. У 1941 годзе трапіў разам з маці ў яўрэйскае гета, з якога пашанцавала выратавацца. Бацька загінуў на фронце ў 1944. У 1944 г. пачаў вучыцца ў музычным вучылішчы па класе кларнета. У 1945 г. наведваў мастацкую студыю С.П. Каткова. Падчас службы ў арміі займаўся ў армейскай вакальнай студыі пад кіраўніцтвам Народнага артыста СССР І.С. Патаржынскага. У 1950-я гг. пазнаёміўся з віленскім кантарам Крэмерам і кампазітарам Г.М. Вагнерам, якія сталі першымі настаўнікамі Наліваева па кантарскім спевам. У 1970-х – 1980-х гг. разам з імі ўдзельнічаў у фестывалях кантарскай музыкі ў Маскве. Доўгія гады збіраў і запісваў старажытныя кантарскія малітвы. У 1963 г. вучыўся ў Празе, дзе скончыў Вышэйшыя курсы па рэстаўрацыі. З’яўляўся першым дырэктарам музея “Гасцёўня У. Галубка”. У 1990-х гг. удзельнічаў у спектаклях Беларускага акадэмічнага рускага тэатра ў Мінску (“Перпетуум мобиле, или Вечер

еврейского анекдота”, “Исход” рэж. Б. Луцэнка;). У 2002 г. кінарэжысёр Ю.М. Гарулёў зняў пра А.А. Наліваева фільм “Истоки”. У 2005 г. разам з Ю.Р. Гарадзецкім выконваў яўрэйскія песні ў спектаклі рэж. В. Анісенкі “На улице Островской”, пастаўленага ў Тэатры беларускай драматургіі. У 2008 г. у фільме А. Гарадніцкага “В поисках идиша” спявае памінальную малітву на месцы растрэлу узнікаў Шклоўскага гета. У 2012 г. зняўся ў ролі кантара ў мастацка-дакументальным фільме рэж. З. Катовіч “Марк Шагал. Нереальная реальность”.

З дзяцінства меў фатаграфічную памяць, што дазволіла тайна маляваць разбураную сталіцу (у 1940-я – 1950-я гг. фатаграфаваць і замалёўваць Мінск было забаронена). Да 1960-х гг. ён паспеў замаляваць старыя вуліцы Мінска – Верхні горад, Троіцкае прадмесце і іншыя месцы цэнтральнай часткі горада, якія потым былі знішчаны альбо змяніліся да непазнавальнасці. Пачынаючы з к. 1970-х гг. стварыў галерэю партрэтаў вядомых беларускіх дзеячаў літаратуры і мастацтва. Удзельнік мастацкіх выстаў (“Наш город. Еврейские места старого Минска” у яўрэйскім грамадскім доме г. Мінска (2004), “Воспоминания об утраченном. Еврейские уголки послевоенного Минска” (2008) у музеі гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі, “Минские пейзажи” (2009) у Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь, “Послевоенный Минск в картинах Анатолия Наливаева” (2013) у Доме-музеі I з’езда РСДРП, “Здесь было Минское гетто” (2014) у мінскай бібліятэцы імя А. Пушкіна і інш. Творы А.А. Наліваева знаходзяцца ў БДАМЛМ, Літаратурным музеі М. Багдановіча, Шклоўскім краязнаўчым музеі, Музеі гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі і інш.

А.А. Наліваеў памёр 6 студзеня 2021 г.

У дзевятым раздзеле знаходзіцца пейзаж М. Нойс-Штубэ “Withstok. Garde” [“Высока. Гардно”]. **Нойс-Штубэ Маргарэт (Margarete Neuss-Stubbe)** нарадзілася 31 мая 1895 г. у г. Берліне (Германія). У 1903 г. сям’я пераехала у г. Слупск (Słupsk) (Паморскае ваяводства, Польшча). Дзед Карл Штубэ быў уладальнікам млына ў мястэчку Смолдзіна (Smołdzino) (Слупскі павет, Паморскае ваяводства, Польшча), а бацька – Герман Штубэ быў інжынерам, які ў 1903 г. заснаваў у Слупску ўласную фабрыку "Zakład Budowy Młynów” (“Завод па будаўніцтве млыноў”). У 1913–1918 гг. Маргарэт вучылася ў Берліне ў школе мастацкіх рамёстваў і аднačасова наведвала заняткі па фартапіяна ў Шарлоты Каўфман. Разам з малодшымі братамі і сёстрамі кожныя святы і канікулы праводзіла ў Смолдзіна ў сваіх бабулі і дзядулі, а ў 1921 г. яна пераехала сюды жыць. У 1927 г. за некалькі кіламетраў ад Смолдзіна пабудавала ўласны дом у вёсцы Высока на возеры Гардно. У 1947 г. прымусова была выслана з Польшчы, пасялілася ў г. Вісбадэне (Германія). Належыла да групы “Krąng Tworzących Artystów” (“Кола творчых мастакоў”) і разам з імі прымала ўдзел у мастацкіх выставах. Часцей за ўсё

малявала пейзажы, нацюрморты, партрэты: “Córka rybaka” (“Дачка рыбака”), “Portret chłopca” (“Партрэт хлопца”), “Ujście Łupawy w Rowach z Rowokołem w tle” (“Вусце ракі Лупава ў Ровах на фоне горада Равакол”), “Wejście do wsi” (“Уваход у вёску”), “Wnętrze” (“Інтэр'ер”), “Żółte tulipany” (“Жоўтыя цьльпаны”) і інш. У апошнія гады жыцця звярталася пераважна да рэлігійных тэм.

М. Нойс-Штубэ памерла 15 красавіка 1978 г.

Дзесяты раздзел – гэта лінагравюра з выявай Спаса-Ефрасінеўскага манастыра ў Полоцку з подпісам [У.Д. Шапо].

Адзінадцаты раздзел складаецца з жывапісных эцюдаў неўстаноўленых мастакоў (6). Справы ў ім сфарміраванывпа алфавіце назваў прац.

Прадмову склала — Г.Б. Багамолава
вяд. архівіст
20.01.2026 г.

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ФОНД № 374
ВОПІС № 3
1945-2013

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 22.01.2026 г.
№ 2

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ С.У. АСТРОЎСКАЙ** | | | | |
| 1 | С.У. Астроўская. "Мае кніжкі любімага паэта". Нацюрморт.<br>Холст, алей | 1981 | 1 | 1 | |
| 2 | Дакументы С.У. Астроўскай і пра яе: аўтабіяграфія (аўтограф) і біяграфічныя звесткі, запісаныя Я.Я. Квяткоўскай; фатаграфіі С.У. Астроўскай, індывідуальная і ў группе з С.Л. Абрамовіч, В.В. Дзёмкінай, С.С. Катковай, Я.Я. Квяткоўскай, З.В. Літвінавай, М.С. Ракіцкене і інш. | 1990, 2012-2013 | 6 | 6 | |
| | **2. ЭЦЮД ДА КАРЦІНЫ Г.С. ВІЕРА** | | | | |
| 3 | Г.С. Віер. "Встреча Красной Армии". Эцюд да карціны.<br>Холст, алей | 1945 | 1 | 1 | |
| | **3. ЭЦЮД ДА КАРЦІНЫ В.Ф. КАЗАЧЭНКІ** | | | | |
| 4 | В.Ф. Казачэнка. "Получил пионерский галстук". Эцюд да карціны.<br>Кардо, алей | 1957 | 1 | 1 | |
| | **4. ЭЦЮД ПЕЙЗАЖА І.Р. КРАСНЕЎСКАГА** | | | | |
| 5 | І.Р. Краснеўскі. "На пристани". Пейзаж. Эцюд.<br>Кардон, холст, алей | [1950-я - пач. 1960-х гг.] | 1 | 1 | |
| | **5. ДАКУМЕНТЫ Я. КУЗЬМІЦКАГА** | | | | |
| 6 | Я. Кузьміцкі. "Далёкая блізка". Групавы партрэт.<br>Холст, алей | 1994 | 1 | 1 | |
| 7 | Дакументы Я. Кузьміцкага і пра яго (буклет да персанальнай выставы з біяграфічнымі звесткамі на англійскай і рускай мове, фатаграфія Я. Кузьміцкага з неўстаноўленай жанчынай) | 1999 | 5 | 2 | |
| | **6. ЭЦЮД ДА КАРЦІНЫ К.І. ЛЕБЕДЗЕВА** | | | | |
| 8 | К.І. Лебедзеў. "Партизаны на переправе". Эцюд да карціны.<br>Холст, алей | [к. 1940-х - 1950-я гг.] | 1 | 1 | |
| | **7. ЭЦЮДЫ ПЕЙЗАЖАЎ Г.А. МІЛКОВА** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі справў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 9 | Г.А. Мілкоў. "Вечер". Пейзаж. Эцюд. Кардон, алей | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 10 | Г.А. Мілкоў. "Память". Эцюд. Кардон, алей | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| | **8. ПАРТРЭТЫ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ І ІНШ. А.А. НАЛІВАЕВА** | | | | |
| 11 | А.А. Наліваеў. Партрэт Р. Барадуліна. ДВП, каляровая сухая пастэль | 1982 | 1 | 1 | |
| 12 | А.А. Наліваеў. Партрэт П.У. Броўкі. ДВП, каляровая сухая пастэль | 1979 | 1 | 1 | |
| 13 | А.А. Наліваеў. Партрэт Я. Брыля. ДВП, каляровая сухая пастэль | 1982 | 1 | 1 | |
| 14 | А.А. Наліваеў. Партрэт З. Верас Л.А. Сівіцкай-Войцік). ДВП, каляровая сухая пастэль | 1981 | 1 | 1 | |
| 15 | А.А. Наліваеў. Партрэт У. Галубка. ДВП, каляровая сухая пастэль | 1982 | 1 | 1 | |
| 16 | А.А. Наліваеў. Партрэт Г.І. Гарэцкага. ДВП, каляровая сухая пастэль | 1980 | 1 | 1 | |
| 17 | А.А. Наліваеў. Партрэт М.І. Гарэцкага. ДВП, каляровая сухая пастэль | 1985 | 1 | 1 | |
| 18 | А.А. Наліваеў. Партрэт Р.Г. Гарэцкага. ДВП, каряровая сухая пастэль | 1989 | 1 | 1 | |
| 19 | А.А. Наліваеў. Партрэт С.І. Грахоўскага. ДВП, каляровая сухая пастэль | 1981 | 1 | 1 | |
| 20 | А.А. Наліваеў. Партрэт Н.С. Гілевіча. ДВП, каляровая сухая пастэль | 1983 | 1 | 1 | |
| 21 | А.А. Наліваеў. Партрэт У.С. Караткевіча. ДВП, каляровая сухая пастэль | 1982 | 1 | 1 | |
| 22 | А.А. Наліваеў. Партрэт У.М. Конана. ДВП, каляровая сухая пастэль | 1986 | 1 | 1 | |
| 23 | А.А. Наліваеў. Партрэт К. Крапівы. ДВП, каляровая сухая пастэль | 1981 | 1 | 1 | |
| 24 | А.А. Наліваеў. Партрэт М. Лужаніна. ДВП, каляровая сухая пастэль | 1983 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 25 | А.А. Налівaеў. Партрэт І.М. Лучанка.<br>ДВП, каряровая сухая пастэль | 1980 | 1 | 1 | |
| 26 | А.А. Налівaеў. Партрэт А.Я. Макаёнка.<br>ДВП, каряровая сухая пастэль | 1984 | 1 | 1 | |
| 27 | А.А. Налівaеў. Партрэт А.І. Мальдзіса.<br>ДВП, каряровая сухая пастэль | 1983 | 1 | 1 | |
| 28 | А.А. Налівaеў. Партрэт І.П. Мележа.<br>ДВП, каряровая сухая пастэль | 1981 | 1 | 1 | |
| 29 | А.А. Налівaеў. Партрэт І.Я. Навуменкі.<br>ДВП, каляровая сухая пастэль | 1984 | 1 | 1 | |
| 30 | А.А. Налівaеў. Партрэт П.Е. Панчанкі.<br>ДВП, каляровая сухая пастэль | 1980 | 1 | 1 | |
| 31 | А.А. Налівaеў. Партрэт Я. Скрыгана.<br>ДВП, каляровая сухая пастэль | 1981 | 1 | 1 | |
| 32 | А.А. Налівaеў. Партрэт З.Ф. Стомы.<br>ДВП, каляровая сухая пастэль | 1979 | 1 | 1 | |
| 33 | А.А. Налівaеў. Партрэт І.П. Шамякіна.<br>ДВП, каляровая сухая пастэль | 1983 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 34 | А.А. Налівaеў. Партрэт неўстаноўленага мужчыны.<br>ДВП, каряровая сухая пастэль | 1980 | 1 | 1 | |
| 35 | А.А. Налівaеў. Партрэт неўстаноўленага мужчыны [мастака].<br>ДВП, каряровая сухая пастэль | 1981 | 1 | 1 | |
| 36 | А.А. Налівaеў. Партрэт неўстаноўленага мужчыны.<br>ДВП, каряровая сухая пастэль | 1981 | 1 | 1 | |
| 37 | А.А. Налівaеў. Партрэт будаўніка.<br>ДВП, каряровая сухая пастэль | 1985 | 1 | 1 | |
| | **9. ЭЦЮД ПЕЙЗАЖА М. НОЙС-ШТУБЭ** | | | | |
| 38 | Маргарэт Нойс-Штубэ (Margarete Neuss-Stubbe). "Withstok. Garde" ["Высока. Гардно"].<br>Пейзаж. Эцюд. Холст, алей | [да 1947 г.] | 1 | 1 | |
| | **10. ЛІНАГРАВЮРА З ВЫЯВАЙ СПАСА-ЕФРАСІНЕЎСКАГА МАНАСТЫРА Ў ПОЛАЦКУ** | | | | |
| 39 | [У.Д. Шапо]. "Спасо-Ефросиниевский монастырь. Полоцк". Лінагравюра | 1990 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **11. ТВОРЧЫЯ ПРАЦЫ НЕЎСТАНОЎЛЕНЫХ МАСТАКОЎ** | | | | |
| 40 | Неўстаноўлены мастак. ["Лодки на берегу озера"]. Пейзаж. Эцюд. | XX ст. | 1 | 1 | |
| 41 | Неўстаноўлены мастак. ["Операция в полевом госпитале"]. Эцюд да карціны.<br>Кардон, алей | XX ст. | 1 | 1 | |
| 42 | Неўстаноўлены мастак. ["Улица в городе"]. Пейзаж. Эцюд.<br>Фанера, алей | XX ст. | 1 | 1 | |
| 43 | Неўстаноўлены мастак. Выявы людзей падчас лесанарыхтоўкі. Эцюд.<br>Холст, [алей, вугаль] | XX ст. | 1 | 1 | |
| 44 | Неўстаноўлены мастак. Партрэт сталага мужчыны. Эцюд.<br>Кардон, холст, алей | XX ст. | 1 | 1 | |
| 45 | Неўстаноўлены мастак. Пейзаж. Эцюд.<br>Кардон, холст, алей | XX ст. | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 45 (сорак пяць)
спраў з № 1 па № 45 , 51 дакумент.

Вопіс склала і апрацоўку
фонду зрабіла
вяд. архівіст Г.Б. Багамолава
2026

Дакументы прынялі:

вяд. архівіст аддзела
забеспячэння захаванасці
дакументаў В.І. Бярэйшык

"_____"____________20____ г.